Ивашкевич О.А.

Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь

**Дзяржаўная ўстанова**
**«Нацыянальная бібліятэка Беларусі»**

прасп. Незалежнасці, 116
220114, г. Мінск,
тэл. 266 37 00, факс 266 37 06
e-mail:inbox@nlb.by
http://nlb.by

Министерство культуры Республики Беларусь

**Государственное учреждение**
**«Национальная библиотека Беларуси»**

просп. Независимости, 116
220114, г. Минск,
тел. 266 37 00, факс 266 37 06
e-mail:inbox@nlb.by
http://nlb.by

15.01.2015 № 65

на № ______ ад ______

Рэктару
Беларускага дзяржаўнага
ўніверсітэта
Абламейку С.У.

вул. К. Маркса, 31
220030, г.Мінск

Аб удзеле ў канферэнцыі

Шаноўны Сяргей Уладзіміравіч!

Дзяржаўная ўстанова «Нацыянальная бібліятэка Беларусі» запрашае Вас і супрацоўнікаў Вашай арганізацыі прыняць удзел у XI Міжнародных кнігазнаўчых чытаннях «Кніжная культура Беларусі XI – пачатку XX ст.», якія адбудуцца 16 –17 красавіка 2015 г.

Праблемнае поле канферэнцыі:

1. Рукапісная кніжная культура Беларусі.
2. Мастацкае афармленне рукапіснай і друкаванай кнігі.
3. Беларуская рукапісная і друкаваная кніга ў беларускіх і замежных сховішчах.
4. Спадчына Францыска Скарыны і яго пераемнікаў.
5. Беларускія друкарні XVI–XVIII стст.
6. Беларуская кніга XIX – пачатку XX ст.
7. Кніжная спадчына Радзівілаў.

Удзельнікам XI Міжнародных кнігазнаўчых чытанняў прапануем звярнуць увагу на юбілеі, якія будуць адзначацца ў 2015 годзе:

525 гадоў з дня нараджэння Францыска Скарыны (1490(?), г.Полацк – 1551(?));

500 гадоў з дня нараджэння Мікалая Радзівіла Чорнага (04.02.1515 – 1565);

440 гадоў з часу выдання «Евангелля напрастольнага» Пятром Мсціслаўцам у друкарні братоў Мамонічаў (1575);

310 гадоў з дня нараджэння Францішкі Уршулі Радзівіл (13.02.1705 – 1753);

325 гадоў з пачатку існавання Супрасльскай друкарні (пач. 1690-х –

Белорусский государственный университет
Управление организационной работы и документационного обеспечения
«20» 01 2015 г.
№ 173

1803);

240 гадоў з пачатку існавання Гродзенскай друкарні (Гродзенскай каралеўскай друкарні) (1775–1796(?));

175 гадоў з дня нараджэння Марыі Дароты дэ Кастэлян Радзівіл (1840–1915);

140 гадоў з дня нараджэння Марціна Кухты (06.02.1875 – 1941 ці 1942).

Мовы канферэнцыі: беларуская, руская, польская, англійская.

Для ўдзелу ў канферэнцыі з дакладам альбо паведамленнем неабходна не пазней 1 красавіка 2015 г. прайсці анлайн-рэгістрацыю на інтэрнэт-партале Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі www.nlb.by.

Плануецца выданне зборніка матэрыялаў канферэнцыі. Прымаюцца арыгінальныя работы, якія маюць навуковае і прыкладное значэнне. Аргкамітэт пакідае за сабой права адбору дакладаў для ўдзелу ў канферэнцыі і артыкулаў для апублікавання. Файл з тэкстам даклада неабходна выслаць па электроннай пошце kireeva@nlb.by не пазней за 15 сакавіка 2015 г.

Патрабаванні да афармлення даклада:

Прозвішча, імя, імя па бацьку (цалкам) аўтара/суаўтараў, поўная назва арганізацыі, горад, краіна; прозвішча, імя, імя па бацьку (цалкам) асобы, якая будзе прадстаўляць даклад на канферэнцыі, назва даклада.

Аб'ём даклада разам з рэзюме на рускай і англійскай мовах, ілюстрацыямі і дадаткамі – не больш за 6 старонак фармату А4, Times New Roman, 13 кегль, палутарны міжрадковы інтэрвал, тып файла – doc альбо rtf (Microsoft Word).

Спіс выкарыстаных крыніц афармляецца пасля асноўнага тэксту ў алфавітным парадку. Спасылкі афармляюцца ў квадратных дужках у канцы сказа, напрыклад [3, с. 15].

Рэзюме на рускай мове аб'ёмам не больш за 700 сімвалаў (з прабеламі), рэзюме на англійскай мове не больш за 500 сімвалаў (з прабеламі).

Пражыванне, харчаванне, транспартныя выдаткі – за кошт удзельнікаў канферэнцыі.

Каардынатар: Кірэева Галіна Уладзіміраўна, тэлефоны: (8 017) 293 27 81, факс: (8 017) 266 37 06, e-mail: kireeva@nlb.by

Намеснік дырэктара па
навуковай рабоце і
выдавецкай дзейнасці А.А.Суша

22. Кірэева 293 27 81